Цішчанка, В. В. Вялікі князь літоускі як суддзя у 1492-1529 гг. (Практычны і юрыдычны аспекты дзейнасці) / В. В. Цішчанка // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 3 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэдактар) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 65–73.

***В. В. ЦІШЧАНКА***

# ВЯЛІКІ КНЯЗЬ ЛІТОЎСКІ ЯК СУДДЗЯ Ў 1492—1529 гг. (Практычны і юрыдычны аспекты дзейнасці)

У ВКЛ канца XV — першай трэці XVI ст. ажыццяўленне правасуддзя з’яўлялася адным з галоўных праў вялікага князя. У некалькіх артыкулах агульназемскага прывілея 1492 г. у ВКЛ быў пакладзены пачатак юрыдычнаму замацаванню ўжо існуючай практыкі сумеснага ажыццяўлення суда вялікім князем і Радай (панамі-рады). У артыкуле 14 названага прывілея манарх абяцаў, што ўсе «суды, якія мы з нашымі панамі і раднымі выра- шылі, ухвалілі і заключылі, ні з кім іншым абавязваемся не змяняць, выпраўляць або перапарадкоўваць». У 27 артыкуле Аляксандр Казіміравіч абяцаў тэрмінова разгледзець справы, якія цягнуліся ад часоў яго бацькі і «ўчыніць усялякую справядлівасць з панамі радай нашай». Артыкулы 29 і 33 сведчылі, «што важныя справы аб спадчынных добрах ці пакрыўджанні імя або гонару… ці іншыя больш цяжкія» вялікі князь павінен быў разгля- даць і вырашаць «з панамі радай нашай»[1]. Аб сумесным судзе вялікага князя і паноў-рады афіцыйна сведчылі многія артыкулы Статута 1529 г. У арт. 14 р. I Жыгімонт Стары абяцаў, што справы, якія цягнуліся яшчэ з часоў Казіміра і Аляксандра «хочем и будем повинни с порадою рад наших всякую справедливость чинити без отволоки». У арт. 20 р. I было адзначана: «Тэж коли бы хто на честь кому приганил або о добрую славу, а то бы ся ку нашои ясности приточило, всим справедливость чинити будем повинни… конечную справедливость без отволоки з радами нашими вчиним». У арт. 18 р. VI было занатавана, што калі б хто-небудзь «кого неучтивыми словы зсоромотил, тогды маеть тот его позвати перед нас, господара, або перед паны, а в том ся маеть ему з судьею справедливость стати водлуг писаных прав»[2]. Такім чынам, Рада афіцыйна замацоўвала за сабой правы сачыць за манархам і кантраляваць яго ў першую чаргу пры разглядзе важнейшых судовых спраў.

Наколькі ж манарх у судаводстве быў вымушаны лічыцца са сваімі дарадцамі і як дасягалася згода паміж імі? Гэта пытанне факта, а не права. Закон таго часу (земскія прывілеі, Статут 1529 г.) толькі санкцыяніраваў нормы звычаёвага права, якое не валодала выключнай абавязковасцю. З упэўненасцю можна сцвярджаць толькі тое, што ўладар быў звязаны згодай (часам магчымай) радных паноў, а ўсё астатняе залежала ад канкрэтных умоў. Нават калі вярхоўны ўладар дзейнічаў самастойна, ён усё роўна ўлічваў па-



зіцыю Рады і імкнуўся, каб яго рашэнні не супярэчылі звычаёваму праву і інтарэсам паноў-рады. У выніку рознагалоссяў манарх быў вымушаны часцяком саступаць ім[3].

Неабходна заўважыць, што і члены Рады не мелі поўнай самастойнасці ў судаводстве ВКЛ. Нават тады, калі крыніцы ўпаміналі радных паноў, якія дзейнічалі быццам бы самастойна, апошнія выконвалі свае судовыя функцыі з ведама і паводле загаду вялікага князя. На гэты конт вельмі пераканаўча выказваўся арт. 5. р. VI Статута 1529 г. Ён сцвярджаў, што самі радныя паны прызначаліся суддзямі па загадзе вярхоўнага ўладара: «бо мы *з рамени нашого господарского уставляем комисарами панов рад наших*, абы справедливость подданым нашим чинили»[4].

У абсалютнай большасці выпадкаў крыніцы сведчаць, што вялікі князь вырашаў судовыя справы разам з панамі-рады. «Смотрели есьмо того дела с паны радами н(а)шими… А такъ мы, того привиля н(а)шого огледав и с паны радами досмотревъшы, заставили». «Намъ и паномъ радомъ нашимъ видело ся, и такъ есьмо сказали». «И мы есьмо с паны радами нашыми зрозумели». «И мы то дали на росознанье всих пановъ рад н(а)шыхъ, какъ духовъных, такъ и светцъкихъ. И панове рада н(а)ши тому зрозумели»[5].

У 1496 г. у прысутнасці членаў Рады Аляксандр судзіў смаленскага акольнічага Івашку Крыўца, Яна, Паўла і Міхайлу Басічаў, Андрэя Свірыдонава з мцэнскім намеснікам і любуцкім намеснікам Багданам Сапежычам спрэчкі аб маёнтку Пагонавічы[6]. У 1502 г. Аляксандр на пасяджэнні Рады вынес «вырокъ межи воеводою Троцким паномъ Яномъ Юревичемъ а братиею его, паны Олехновичами о делъ ровный». Прадастаўленыя пісьмовыя доказы ацэньваліся гаспадаром і раднымі панамі, пасля чаго сумесна было вынесена рашэнне[7]. 2 верасня 1508 г. Жыгімонт вынес вырак у справе аб прызнанні нейкіх людзей путнымі, а не цяглымі: «Ино мы с Паны Радами нашыми того межы ними досмотревъшы и такъ есмо въчынили». Пайменна называліся троцкі ваявода М. М. Радзівіл, гетман, маршалак Валынскай зямлі князь К. І. Астрожскі, кашталян троцкі, староста жамойцкі С. Яновіч[8]. У 1522 г. манарх разам з Радай судзіў суддзяў, якія незаконна прысудзілі маёнтак Вортал, які належаў дзецям Льва Багавіцінавіча, пану Юрыю Іванавічу Ілінічу. Прычым маёнтак не вяртаўся, а толькі кампенсаваліся страты за кошт суддзяў[9].

У складзе Рады ў гаспадарскім судзе магло ўдзельнічаць ад 2—3 да 20 і болей асоб. Усё залежала ад

канкрэтнай сітуацыі і складанасці спраў. Побач з манархам звычайна знаходзілася некалькі дарадцаў і было выключнай з’явай, калі ён заставаўся без радных паноў[10].



Часам у судовых выраках вялікага князя адсутнічала ўказанне на ўдзел у судзе радных паноў. Па-першае, гэта магло быць выклікана адпаведнай рэдакцыяй дакументаў, а таксама адсутнасцю патрэбы кожны раз апісваць абставіны, пры якіх адбываўся суд, што было і так добра вядома тагачаснаму грамадству. Па-другое, напэўна тады, калі не адбывалася соймаў паноў-рады, пры двары магло прысутнічаць толькі некалькі членаў Рады. Аднак і яны маглі мець нейкія даручэнні. Таму правіцель у такіх вельмі рэдкіх (можна сказаць выключных) выпадках самастойна вяршыў суд. Звычайна ён браўся аднаасобна ці ў прысутнасці выпадковых асоб, не членаў Рады, разглядаць простыя, прадказальныя справы. Так, у 1494 г. гаспадарскія сяляне скардзіліся на любуцкага і мцэнскага намесніка Багдана Сапегу, што ён самавольна сагнаў іх з зямлі. Але хутка сяляне прызналі, што іх бацькі пакідалі спрэчныя землі і згубілі права на іх. Пакінутыя ўладанні былі вызначаны пусткамі і дадзены Сапегу, які прадаставіў адпаведны прывілей[11]. У 1499 г. вялікі князь самастойна вынес вырак у спрэчцы паміж бранскім баярынам Нікіфарам Іванавічам і гаспадарскім дваранінам Цімафеем Капустай наконт прыналежнасці сяла Суботаўскага. Яно было цалкам прадказальна прысуджана Нікіфару Іванавічу пасля прадастаўлення адпаведных дакументаў на права ўладання[12]. У 1510 г. Жыгімонт самастойна судзіў 5 гаспадарскіх людзей Берасцейскага павета з берасцейскім мешчанінам Багданам Марковічам, быццам бы апошні забраў іх спадчынную зямлю ў Самовічах[13]. У 1523 г. вярхоўны ўладар, знаходзячыся ў Кракаве, аднаасобна судзіў некалькіх драгічынскіх земян аб прыналежнасці нейкай зямлі. Пасля разгляду дакументаў, якія былі прадастаўлены адным з бакоў, адразу быў вынесены вырак на яго карысць[14]. У тых выпадках, калі вялікі князь не мог вырашыць пэўныя судовыя справы самастойна ці ў прысутнасці асобных членаў Рады (гэта было даволі часта), ён адкладваў іх на іншы час, да прысутнасці паноў-рады ў больш поўным складзе (да свайго вяртання ў ВКЛ, калі знаходзіўся ў Польшчы, да сойма паноў-рады і г. д.). У 1494 г. Аляксандр справу князя Свірскага з Каспарам Германовічам аб маёнтку адклаў «до тых мест, поки при нас будут панове рада наша, а какъ… будутъ при насъ панове вси и мы о томъ хочемъ съ паны радою нашою помысливши и тому делу конецъ вчинимъ»[15]. У 1501 г. троцкі ваявода пан Ян Забярэзінскі «искалъ… подъ паномъ кухмистромъ (панам Пятром Аляхновічам. — *В. Ц.*) именя, отчины свои, у Ошмене». Справа была такой складанай, што «великий князь, на тое мере тое дело оставилъ: маетъ е. м. тому конецъ и всказане вделати… какъ будутъ при е. м. вси панове рада»[16]. У чэрвені 1510 г. у Кракаве Жыгімонт Стары адклаў разгляд



справы падчашага Мікалая Філіпоўскага аб доме «на него спалом, до приеханья господарского в Литву»[17]. У 1528 г. манарх адклаў нейкаму Івану Совіну разгляд справы «о именье близскость свою и о вено… на иншыи час»[18].

Месцам велікакняжацкага суда з’уляўся «двор господарский», гэта значыць, што суд адбываўся там, дзе знаходзіўся сам вялікі князь. Гэта магло быць любое месца ў ВКЛ ці ў Польшчы (часцей за ўсё гаспадар знаходзіўся ў Вільні і Кракаве). Той, хто выклікаўся на гаспадарскі суд, быў абавязаны «перед Нами (манархам. — *В. Ц.*) стати… где кольвек мы двором нашим будем мешкати»[19].

Велікакняжацкім судом у поўным складзе лічыўся суд манарха разам з раднымі панамі. Аднак вырашаць усе справы, нават паміж вышэйшым набілітэтам, вялікі князь не мог проста фізічна. Таму часта ён самастойна ці з раднымі панамі даручаў судзіць Радзе, асобным панам-рады ці камісіям з іх складу, якія вяршылі правасуддзе ад імя правіцеля. Прычым усе выракі, якія выносіліся па загадзе манарха прызначанымі суддзямі, павінны былі зацвярджацца ім. Да нашага часу захаваліся шматлікія загады манарха панам-рады ці іншым ураднікам ажыццяўляць суд. У 1494 г. вялікі князь Аляксандр даручыў ковенскаму намесніку пану Станку Касцевічу і маршалку, мерацкаму намесніку Станіславу Глябовічу рассудзіць двараніна пана Яцка Капачэвіча з пані Васкавай Паўловіча: «штожъ дей она… в ловищах его, людей своих… посадила»[20]. У 1528 г. Жыгімонт загадаў усім панам-рады разгледзець справу паміж пані Ганнай, жонкай Барташа Табаровіча з троцкім цівуном, пунскім і валкініцкім намеснікам панам Мацкам Кунцовічам: «з росказаня н(а)шого, вси панове рады н(а)шы… о тыи именья смотрели»[21].

Вялікі князь прызначаў суддзяў, а потым на падставе іх суда выносіў канчатковыя рашэнні ці пацвярджаў выракі. Так, у 1495 г. у справе паміж земянамі Дарагіцкімі, Вадынскімі і Пагарэльскімі «о кгрунты и о границы» Аляксандр пацвердзіў суд камісараў, якія высылаліся на месца: «И мы, водлугъ ихъ листу судового, Погорелскихъ же въ томъ есмо оправили»[22]. Але суддзі даволі часта звярталіся да вялікага князя за навукай ці адкладвалі справу на яго рашэнне, што падкрэслівала іх несама- стойнасць і залежнасць ад вярхоўнага ўладара. «И мы, судьи, тую реч поведили господару… и господар… науку рачыл дати». «И мы то господару… оповедили, и господар… рачылъ то знайти… и усказалъ его милость». «И мы, подлугъ воли и

росказанья господарского… дали… нашъ листъ судовый». «Яко жъ и господаря, его милости, въ томъ ся есьмо пытали». «И мы то господару… поведили, и господар … рачылъ такъ знайти… И казалъ его милость того



светъка … опытати … Тотъ децки[й] маеть, опытавшы, и гос- подару, его милости, отказати … Ино господар … рачылъ рокъ положыти».

«И тотъ есьмо суд свой господару… отъказали и пытали есьмо короля … Господару… видело се такъ». «И мы то отложыли до господара»[23].

Да выдання Статута 1529 г. можна было, мінуючы ўсе астатнія суды, звяртацца за правасуддзем непасрэдна да вялікага князя. З 1529 г. гэтае права адмянялася, і справа, разгляд якой пачаўся ў адным судзе ніжэйшай інстанцыі, павінна была ў гэтым судзе і скончыцца. У арт. 1 р. VI было занатавана: «В суду нихто ся не маеть отозвати перед правом ни до нас, господара, ни до сойму, для того, абы в том волокиты не было, але повинен будеть кождый один другому достояти права аж до конца»[24].

Манарх мог вырашаць усе судовыя справы ў краіне. Але некаторыя з іх, найбольш важныя, складалі выключную кампетэнцыю гаспадарскага суда. У першую чаргу неабходна назваць палітычныя злачынствы («здрада»), а таксама справы, за якія пагражала пазбаўленне шляхецкага гонару («о чести»), што часта было звязана са смяротным пакараннем і канфіскацыяй маёмасці. Непасрэдных указанняў аб падсуднасці спраў аб здрадзе няма. Але ўскосныя сведчанні і судовыя акты паказвалі, што суд над здраднікамі і іх пакаранне належалі манарху і Радзе.[25]

Выключна суду вялікага князя належалі справы аб гаспадарскіх маёнтках і даходах, наездах, абразе манархічнай улады (невыкананні выракаў вярхоўнага ўладара, знішчэнне гаспадарскіх лістоў, іх порча, фальсіфікацыя), ваенныя злачынствы. Выключна падсуднасці манарха падлягалі земскія і дворныя ўраднікі, радныя паны, буйнейшыя князі і паны, адкупшчыкі мыт, корчмаў і іншых дзяржаўных прыбыткаў, усе асобы, якія валодалі так званымі «закрывальнымі лістамі»[26]. Артыкул 5 р. VI Статута 1529 г. казаў аб гэтым наступнае: «...естли ж бы хто мел листы наши таковые, абы его нихто не судил, кром нас, господара»[27]. Статут 1529 г. з усёй сукупнасці прывілеяванага саслоўя вылучаў «панов, которыи в поветах не судятся», княжат і паноў, «которые не седят в поветех»[28]. Насельніцтва гарадоў па магдэбургскім праве ў якасці найвышэйшага суда таксама магло звяртацца да манарха са скаргамі на суд бурмістраў і радцаў[29].

Статут 1529 г. канчаткова юрыдычна акрэсліваў за вялікім князем статус вярхоўнага суддзі і вышэйшай апеляцыйнай інстанцыі ВКЛ. З усяго зместу Статута выцякала права гаспадара выступаць пры канчатковым рашэнні любых спраў у якасці апошняй апеляцыйнай інстанцыі. Так, у пачатку р. VI



было занатавана: «Естли бы которой стороне сужоной в том кривда ся видела, жебы не подле того права писаного сужоно, тогды, коли мы сами, господар, со всими паны радами нашими, а без бытности нашое панове рада наша будуть где-колве на первом сойме, оный, которому в том кривда будеть, маеть о том на того пана, врадника нашого, нам або паном радам нашим жаловати. Мы або панове рада наша мають книги того права писаного отворити и того смотрети… Пак ли ж бы тот суд иначей был сужон, не так, яко ест в книгах писаного права выложоно, тогды мы або панове рада наша мають книги отворити водле тых прав писаных, которые есмо всей земли дали, сказане вчинити». У арт. 1 р. VI Статута 1529 г. працягвалася: «А естли бы ся видело водле сказаня которой стороне кривда, а бачила бы сторона, иж ей не водле права писаного всказано, тогды маеть листа просити в суде сказаня своего, которым обычаем сказали на нем. А судьи повинни будуть ему дати лист под печатью своею, а он маеть з оными судьями перед нами або на первом сойме говорити и лист тых судей вказати»[30]. Але манарх павінен быў дзейнічаць у судзе разам з панамі-рады і пад іх кантролем, дзякуючы чаму велікакняжацкая ўлада ў судаводстве падвяргалася пэўнаму абмежаванню з боку паноў-рады. Судовае рашэнне вялікага князя было канчатковым і, як афіцыйна сведчыў арт. 23 р. I Статута 1529 г., нават простая нязгода з ім ужо разглядалася як злачынства: «Естли бы што господар с паны радами нашол и сказане свое господарское вчинил, а хто бы хотел напротивку тому выроку господарскому быти, тогды таковый, будеть какого-колве стадла, так вышшего яко и нижнего, маеть у везеню седети шесть недель, а до скарбу господарского предся маеть дати дванадцать рублев грошей»[31]. Аднак на практыцы, асабліва ў адносінах да магнатаў, рэалізаваць названую пастанову было практычна немагчыма.

Не заўсёды падданыя жадалі падпарадкоўвацца манаршаму суду, што сведчыла аб слабасці цэнтральнага дзяржаўнага выканаўчага апарата ў цэлым і канкрэтна судовай улады манарха. Так, у 1501 г. лідскі баярын Сенка Андрушэвіч не хацеў выконваць судовых пастаноў Казіміра і Аляксандра, якія тычыліся падзелу маёнтка. У 1503 г. манарх разглядаў справу паміж пісарам Грамыкам Ісаевічам і троцкім ваяводам, земскім маршалкам панам Янам Забярэзінскім, і прысудзіў маёнткі першаму з іх. Аднак ваявода выканаў пастанову толькі пасля неаднаразовых зваротаў Аляксандра і тое ў прысутнасці паноў-рады[32]. У 1503 г. правіцель

разглядаў разам зраднымі панамі справу маршалка і наваградскага намесніка Ольбрахта Гаштольда з маршалкам Янам Радзівілам аб скарбах, якія засталіся пасля смерці жонкі пана Яна, сястры Гаштольда. Радзівіл з'явіўся на гаспадарскі суд толькі на трэці раз, і тое «не хотел… гсдра, и



панов рады… в томъ праве послушонъ бити», патрабуючы папскага суда, чаго да таго часу ніколі не было[33]. На судзе Жыгімонта Старога ў снежні 1522 г. узнімалася пытанне аб тым, што паны Мікалай і Міхайла Зяноўевічы моцна збілі гаспадарскага двараніна, які ехаў да іх з судовым лістом ад вялікага князя: «листа г(о)с(по)д(а)ръского не вчстившы, того боярина збили и змордовали»[34]. Вялікі князь Жыгімонт Стары некалькі разоў прызначаў судовыя тэрміны жмудскаму біскупу Мікалаю з велікакняжацкімі падданымі наконт яго злачынстваў супраць апошніх. Але біскуп на іх не з'яўляўся. Нават калі каралева і вялікая княгіня Бона Сфорца і некаторыя члены Рады папрасілі манарха прызначыць чарговы судовы тэрмін, і тады ён не з'явіўся на суд. Правіцель не мог прымусова даставіць у суд такую значную асобу і толькі пасля неаднаразовых зваротаў вырашыў дапусціць пацярпелы бок да прысягі, якой гаспадарскія падданыя павінны былі засведчыць свае страты. Вярхоўны ўладар пагражаў, што «пакъ ли ж бы еси на тотъ рокъ к тои присязе самъ не стал, ани тежъ кого на свое местъцо не прыслал, тогъды мы, г(о)с(по)д(- а)ръ, будемъ ведати, што маемъ с тымъ чынити»[35]. Аднак сказаць з упэўненасцю, што гэтая справа была даведзена да канца, мы не можам, бо калі прысяга была прынесена, а вырак вынесены, то яго неабходна было выканаць. А пры гэтым узнікалі яшчэ большыя цяжкасці.

Сам вялікі князь сваёй нестабільнасцю ў судовых адносінах падрываў аўтарытэт уласнага суда. Насуперак уласным сцвярджэнням ён неаднаразова змяняў уласныя рашэнні. Пастановы на падставе аднабаковых прадстаўленняў спраў, саступкі перад націскам уплывовых асоб прыводзілі да змены пазіцыі вярхоўнага ўладара, часам нават неаднаразова. Так, у складанай справе падзелу спадчыны віленскіх мяшчан Жыгімонт І тройчы мяняў пазіцыю. Спачатку, у чэрвені 1524 г., ён загадаў войту, бурмістру і радцам здзейсніць падзел згодна з магдэбургскім правам, паводле якога даччын шлюбны пасаг павінен быў перададзены дачцэ, а доля, якая выдзялялася сыну, — сыну. Пазней, у лістападзе гэтага ж года, у выніку заступніцтва канцлера О. М. Гаштольда правіцель змяніў пазіцыю і, адступаючы ад магдэбургскага права, распарадзіўся падзяліць увесь маёнтак на роўныя часткі, як рабілася дагэтуль, праз тры гады (у 1527 г.) вярнуўся да першага выраку. Частыя і доўгія знаходжанні вялікага князя ў Польшчы прыводзілі да таго, што «лісты», якія ён там выдаваў, не толькі не маглі спасылацца на даўнейшую дакументацыю, але часта нават супярэчылі выракам і рашэнням паноў-рады, якія ў адсутнасць правіцеля ажыццяўлялі ў ВКЛ найвышэйшую ўладу. За гэта манарх неаднаразова быў вымушаны апраўдвацца, адначасова касуючы свае пастановы, супярэчныя з рашэннямі радных паноў[36].



Судаводства вельмі замаруджвала дзейнасць вялікага князя і перашкаджала займацца неадкладнымі дзяржаўнымі справамі. Асабліва яскрава гэта праяўлялася на соймах. Напрыклад, адзін са сведкаў Віленскага сойма 1528 г. пісаў 20 чэрвеня наступнае: «Да ўчарашняга дня, акрамя разбору бясконцых скарг, абвінавачванняў і даносаў, нічога больш не зроблена; я чуў, як сам кароль некалькі разоў скардзіўся, што ён вельмі засмучаны гэтымі справамі. Сейм, даўно ўжо прызначаны і затым абвешчаны ў другі раз, да гэтых часоў яшчэ не пачаўся… між тым на сейм з'ехалася дастаткова шматлікая колькасць правінцыялаў, і яны губляюць час не без прыкрасці»[37].

Такім чынам, у канцы XV — першай трэці XVI ст. у судаводстве ВКЛ вялікі князь заставаўся ключавой асобай. Ён з'яўляўся вярхоўным суддзёй і апошняй судовай інстанцыяй у краіне, аднак судзіў звычайна разам з Радай. Дзякуючы гэтаму манарх фактычна падзяляў судовую ўладу з вышэйшай арыстакратыяй краіны, інтарэсы якой увасаблялі паны-рады, трапляў у значную залежнасць ад вышэйшых пасадовых асоб ВКЛ. Такая практыка знайшла юрыдычнае замацаванне ў агульназемскім прывілеі 1492 г. і асабліва ў Статуце 1529 г. Здараліся выпадкі аднаасобнага суда манарха. Але і тады ён павінен быў улічваць магчымыя меркаванні радных паноў. Складаныя справы Аляксандр і Жыгімонт Стары адкладалі да прысутнасці паноў-рады ў як мага больш поўным складзе.

У цэлым у адзначаны прамежак часу судовая ўлада вялікага князя паступова губляла сваю ранейшую магутнасць. Манарх фактычна не меў магчымасці прыцягнуць да адказнасці буйных магнатаў. Асабліва судовая бездапаможнасць правіцеля праявілася пры Жыгімонце Старым, падчас амаль што няспынных канфліктаў, спачатку паміж Радзівіламі і Гаштольдамі, а потым паміж Гаштольдамі і Астрожскімі. Пакуль вялікі князь знаходзіўся ў Польшчы, у ВКЛ фактычна палыхала хатняя вайна, што было раўназначна дзяржаўнай здрадзе, а вінаватыя так і не былі пакараныя. У дадатак значна павялічылася колькасць непадпарадкавання судовым выракам вялікага князя з боку паноў і князёў, якія маглі проста не дапусціць прадстаўнікоў велікакняжацкай адміністрацыі для рэалізацыі прысуду на тэрыторыю сваіх уладанняў. Аслабленне судовай улады вялікага князя знаходзілася ў рэчышчы агульнай тэндэнцыі падзення аўтарытэту

манархічнай улады ў ВКЛ у сувязі з яе палітычнай і эканамічнай слабасцю. Вельмі істотны ўплыў на гэта аказвала тое, што вярхоўны ўладар гадамі адсутнічаў у дзяржаве.

[1] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мінск, 1936. Т. 1. С. 223-225.
[2] Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Минск, 1960.
[3] *Малиновский, И. А.* Рада Великого княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России / И. А. Малиновский. Томск, 1912. Ч. 2. Вып. 2. С. 200.



[4] Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Минск, 1960. С. 74.
[5] Литовская метрика. 15 Книга записей. Вильнюс, 2002. № 36, с. 78, 79; № 37, с. 80; № 44, с. 84; № 52, с. 91
[6] Акты Литовской Метрики. Варшава, 1896. Т. 1. Вып. 1. № 246, с. 95—96
[7] *Малиновский, И. А.* Рада Великого княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России / И. А. Малиновский. Томск, 1912. Ч. 2. Вып. 2. С. 198.
[8] Литовская метрика. 8 Книга записей. Вильнюс, 1995. № 412, с. 310, 311
[9] Литовская Метрика. 11 Книга записей. Вильнюс, 1997. № 120, с. 127
[10] *Малиновский, И. А.* Рада Великого княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России / И. А. Малиновский. Томск, 1912. Ч. 2. Вып. 2. С. 189-192.
[11] Акты Литовской Метрики. Варшава, 1896. Т. 1. Вып. 1. № 94, с. 41
[12] Акты Литовской Метрики. Варшава, 1897. Т. 1. Вып. 2.
[13] Литовская метрика. 8 Книга записей. Вильнюс, 1995. № 509, с. 367—368
[14] Литовская метрика. 4 Книга судных дел. Вильнюс, 1997. № 31, с. 62
[15] Акты Литовской Метрики. Варшава, 1896. Т. 1. Вып. 1. № 123, с. 50
[16] Акты Литовской Метрики. Варшава, 1896. Т. 1. Вып. 1. № 560, с. 69
[17] *Малиновский, И. А.* Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского / И. А. Малиновский. Томск, 1902. С. 297.
[18] Литовская метрика. 15 Книга записей. Вильнюс, 2002. № 3, с. 52
[19] *Малиновский, И. А.* Рада Великого княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России / И. А. Малиновский. Томск, 1912. Ч. 2. Вып. 2. С. 203.
[20] Archiwum ks№ï№t Sanguszkyw w Siawucie. Lwow, 1890. T. 3. № 41, s. 26
[21] Литовская метрика. 15 Книга записей. Вильнюс, 2002. № 6, с. 54
[22] Русская историческая библиотека. Спб., 1910. Т. 27. № 88, с. 605—606
[23] Литовская метрика. 6 Книга судных дел. Вильнюс, 1995. № 20, с. 36; № 43, с. 50; № 46, с. 55; № 70, с. 67; № 83, с. 71, 72; № 111, с. 88; №115, с. 91
[24] Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Минск, 1960. С. 70.
[25] *Малиновский, И. А.* Рада Великого княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России / И. А. Малиновский. Томск, 1912. Ч. 2. Вып. 2.
[26] Русская историческая библиотека. Спб., 1910. Т. 27. № 216, стб. 768—770; 2, № 523, с. 48—49, № 553, с. 66, № 750, с. 181—182; 14, с. 253, 254; 15, с. 416; 5, № 10, с. 8—9
[27] Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Минск, 1960. С. 74.
[28] . Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Минск, 1960. С. 70.
[29] Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. СПб., 1846. Т.1. № 159, с. 181
[30] Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Минск, 1960. С. 69-70
[31] Статут Великого княжества Литовского 1529 г. Минск, 1960. С. 40.
[32] Акты Литовской Метрики. Варшава, 1897. Т. 1. Вып. 2. № 591, с. 84—85; № 663, с. 124—125
[33] *Малиновский, И. А.* Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого княжества Литовского / И. А. Малиновский. Томск, 1902. С. 379-381.
[34] Литовская Метрика. 11 Книга записей. Вильнюс, 1997. № 136, с. 138
[35] Литовская метрика. 15 Книга записей. Вильнюс, 2002. № 75, с. 113, 114
[36] *Бардах, Ю.* Крэва і Люблін. З праблемаў польска-літоўскай уніі // Ю. Бардах. Штудыі з гісторыі Вялікага княства Літоўскага. Мінск, 2002. С. 165-166.
[37] *Максимейко, Н. А.* Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 г. / Н. А. Максимейко. Харьков, 1902. С.124.